партизанского руководства, которое, как свидетельствует соответствующая информационная и отчетная документация, постоянно держало на контроле проблему, связанную с «недооценкой роли женщин в партизанской борьбе».

Таким образом, «истории» партизанских формирований, действовавших на временно оккупированной территории Беларуси, представляют интерес для изучения участия женщин в партизанском движении. Вместе с тем, учитывая специфику данных партизанских материалов, для получения объективной картины их целесообразно использовать в комплексе с другими источниками.

1. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). – Ф. 1450. Оп. 4.

**Згірскі Ю. І.**

## ПРАКТЫКА ВЫКАРЫСТАННЯ ФОТАЗДЫМКАЎ ПРЫ АНАЛІЗЕ МАТЭРЫЯЛАЎ ВУСНАЙ ГІСТОРЫІ НА ПРЫКЛАДЗЕ ДАСЛЕДАВАННЯ БІЯГРАФІІ ЖАЎНЕРА ВОЙСКА ПОЛЬСКАГА З 1939 ПА 1954 ГОД

Наратывы сведкаў гістарычных падзей, як і мемуары, праз спецыфічнасць чалавечай памяці, маюць суб'ектыўны характар, таму іх трэба выкарыстоўваць у сукупнасці з іншымі гістарычнымі крыніцамі. Акрамя, архіўных дакументаў, дапоўніць інфармацыю, атрыманую пры аналізе матэрыялаў вуснай гісторыі, дазваляюць фотаматэрыялы. Асабліва карысным выкарыстанне дадзенай групы крыніц з'яўляецца пры даследаванні біяграфіі таго ці іншага чалавека. У дадзеным артыкуле спалучэнне матэрыялаў вуснай гісторыі і аналіза фотакартак з сямейнага архіва будзе прадэманстравана на прыкладзе вывучэння біяграфіі жаўнера польскага войска – Палячонка Сцяпана Пятровіча (гады жыцця: 1911–1975 гг.), які нарадзіўся і пражываў у вёсцы Дубавое Докшыцкай гміны Дзісненскага павета. У міжваенны перыяд гэта была тэрыторыя польска-савецкага памежжа [1]. У якасці асноўных крыніц былі выкарыстаны ўспаміны дачкі Сіндрэвіч (Палячонак) Зінаіды Сцяпанаўны пра свайго бацьку, а таксама фотакарткі з сямейнага архіва за перыяд з 1939 па 1951 год.

Паводле ўспамінаў Сіндрэвіч Зінаіды Сцяпанаўны вынікае, што яе бацьку прызвалі ў Войска Польскае ў самым пачатку ІІ Сусветнай вайны:

"*Іх во… у Поль (шчы). Вот чаго іх прызвалі? Таму што там немцы напалі. З іх зрабілі тую там, армію, і яго адправілі… дзе ён ваяваў, якім месцам, я ня ведаю, патаму што я не цікавілася. А тады ж немец іх там разбіў. І гэтыя людзі.., а тут гэтыя тэрыторыі вассаедзінілася ў Беларусь. І так аказалася што тут сем'і, а людзі ні там.. яны не іхныя, не палякі, не беларусы, ні якія… [прабел], а так, пасадзіліся ў паязды, і вот яны туды без вінтовак, без нічога паехалі ў Брэст. А з іх так і так сказалі: Вы ваеннапленныя. І ніхто іх дамоў не пусьціў*" [2].

Зінаіда Сцяпанаўна ўскосна ўзгадвае прыкладную дату мабілізацыі – 1939 год. Дадатковыя звесткі паказваюць, што Сцяпан Пятровіч Палячонак не паспеў прыняць удзел у баях, так як быў узяты ў палон савецкімі вайскоўцамі пасля 15 верасня 1939 года. Аналіз дадзенага наратыву дазваляе сцвярджаць, што Сцяпан Пятровіч выправіўся ў войска без часу на зборы, што сведчыць аб яго мабілізацыі паміж канцом жніўня – пачаткам верасня 1939 года.

Апошняе абвяргаецца наяўнасцю фатаздымкаў, зробленых Сцяпанам Пятровічам у перыяд мабілізацыі. Перыяд, агучаны ў наратыве, можна ахарактарызаваць як "паскораную мабілізацыю", што стварала пэўныя перашкоды для стварэння фота, прадстаўленых ніжэй (фота 1, фота 2).

Фота 1 з'яўляецца больш афіцыйным, хутчэй за ўсё для дакументаў, але наяўнасць ва ўласным карыстанні дазваляе сцвярджаць аб тым, што фота было зроблена ў студыі і без спешкі. Сцяпан Пятровіч Палячонак на дадзеным фатаздымку апрануты ў форму Войска Польскага міжваеннага перыяду. Паводле знакаў адрознення вайсковых, можна зрабіць выснову аб мабілізацыі Сцяпана Пятровіча Палячонка ў Войска Польскае ў званні радавога. Чорна-белы фармат фота не дазваляе вызначыць род войскаў па знешніх прыкметах, але наяўнасць знакаў вайсковых дазваляе сцвярджаць, што ў войску Сцяпан Пятровіч быў больш чым месяц (так як падобныя знакі атрымоўваюць падчас падрыхтоўкі вайсковага саставу, на што неабходны час, якога ў жніўні-верасні 1939 года ў Польшчы не было.

Ва ўспамінах Зінаіды Сцяпанаўны Сіндрэвіч, а таксама на адвароце фота, не адзначана асоба саслужбоўца. Паводле знешніх прыкмет, чалавек таксама быў залічнана ў радавы склад Войска Польскага і, магчыма, быў аднавяскоўцам Сцяпана Пятровіча Палячонка. Як было адзначана вышэй, Палячонак С. П. ня мог быць прызваны ў войска ў канцы жніўня 1939 г., так як тагачасныя рэаліі не былі спрыяльнымі для фатаграфавання нефармальнага (фота зроблена ў студыі для ўласнага выкарыстання). Магчыма, ён быў мабілізаваны ў канцы сакавіка пачатку красавіка 1939 г. у межах плана "Захад", зацверджанага 22 сакавіка 1939 г. Галоўнакамандуючым Войска Польскага Э. Рыдз-Смыглы і пачаткам таемнай мабілізацыі, пачатай Галоўным штабам Войска Польскага 23 сакавіка 1939 г.

Рэпазіторый ВГУ

На фота 2 зафіксавана наяўнасць дадатковых элементаў інтэр’еру, а таксама саслужбовец Сцяпана Пятровіча Палячонка.



**Фота 1. Палячонак С. П. у 1939 г. ( з сямейнага архіву Сіндрэвіч Зінаіды Сцяпанаўны)**



**Фота 2. Палячонак С. П. з саслужбоўцам ў 1939 г. (з сямейнага архіву Сіндрэвіч Зінаіды Сцяпанаўны)**

Як было адзначана вышэй, Сцяпан Пятровіч Палячонак пасля 15 верасня 1939 г. трапіў у савецкі палон. Зінаідай Сцяпанаўнай ўзгаданы падрабязнасці лёсу свайго бацькі ў якасці ваеннапалоннага, дзе яму спатрэбіліся навыкі мірнага часу:

*“Перапісалі і адправілі ў Крывы Рог. У лагер ваенны, усё і работайце. Там камні яны далбілі. [прабел]. Бацька быў усё такі кузнец, [прабел] пакуль там разабраліся, і як ён кузнец, а тыж камні рукамі не паб’ешь, камень аб камень, значыць нада кіркі, нада ўсё. Гэта нада рабіць. І бацька, як кузнец, пайшоў па сваей этай самай, па сваіх руках. А так, есці яны там галадалі, вошы кармілі, і мама маладая, гэта быў 40-ы год, ці які там, яшчэ немцы на нас не напалі, вот яна ездзіла к яму, сама. [прабел]. Казала сядзіць там, а ў яго вошы па каўняру там цэпю лётаюць. Вот так яна яго праведала. Можа два разы так з’ездзіла ілі адзін, гэта я забылася. ”* [2].

Рэспандэнт у сваіх успамінах пра бацьку адзначае пабытовыя асаблівасці палонных Войска Польскага з 1939 па 1941 год. Хутчэй за ўсё, гэта пераказ яе маці, якая некалькі разоў наведвала мужа ў лагеры для вязняў. Успаміны даюць магчымасць вызначыць месца дыслакацыі лагера. У выкарыстаным вышэй сюжэце, лагер месціўся ў еўрапейскай частцы СССР, што рабіла магчымым наведванне праз адсутнасць перашкод у часе на дарогу (у параўнанні з падобнымі аб’ектамі ў азіяцкай частцы СССР). Рэспандэнтам не адзначаны іншыя перашкоды (напрыклад, бюракратычныя), якія маглі паўстаць перад жонкай Сцяпана Пятровіча пры наведванні рэжымнага аб’екта.

Зінаіда Сцяпанаўна ў сваіх успамінах пра лёс бацькі пэўным чынам інтэрпрытуе спецыфіку ўзаемаадносін палітычных лідэраў падчас ІІ Сусветнай вайны, а таксама паведамляе пра жыццёвыя перыпетыі Сцяпана Пятровіча ў складзе арміі Андэрса, якая да 1942–1943 гг. фармавалася як польская вайсковая адзінка пад кіраўніцтвам СССР з жаўнераў былога Войска Польскага і рэпрэсаваных жыхароў Заходніх Беларусі і Украіны:

*“А тады, у 41-м, немцы прышлі. І іх, з гэтага самага, зрабілі як бы две арміі. З гэных самых. Там і ўкраінцы былі, і беларусы там, можа і рускія дзе былі, ну хто ў гэтай самай быў. Адну армію аставілі, кажэцца Касцюшка [прабел] сначала яны думалі, што яны будуць умесце з савецкімі салдатамі, а папа папаў у Андэрса. [прабел]. І гэтых салдат, недзе праз Срэднюю Азію, вялі там. Там многа памёрла. І вот іх вялі, яны былі ў Іране, Іраке можа, і аж у Ерусаліме аказаліся. Быў у Іерусаліме, хадзіў па мястах, купіў іконку. Тут у мяне ёсць эта іконка, а тады іх пасадзілі на караблі, тыж панімашь што гэта не цяперашні транспарт, Сталін з Андэрсам паругаўся, а Сталін з Чэрчылям нармальна. І тады саюзнікі адкрылі ватры фронт. Андэрсаву армію яны павязлі туды Італію асвабаждаць. І ніхто там ня мог узяць гэту вышку, Монтэ-Касына, крэпасць такая была. А нашы беларусы, хоць цяпер і Англія хваліцца, но снабжала гэтую армію Англія, таму што дзе ж савецкім, яны ж самі ў прогаладзь жылі. [прабел]. І тады Андэрс, я ад чалавека дазналася папа ня мог рассказываць, яго жаль зжымала, ён ня мог*

Рэпазіторый ВДУ

*рассказываць. [прабел]. У папы медаль была і крэст за гэта Монтэ-Касына. Бераглі, але я цяпер дзецям аддала, на памяць. Не прадаваць жа, бо гэтых медалей зусім нямножка "* [2].

У сямейным архіве Палячонкаў адсутнічаюць фатаграфіі Сцяпана Пятровіча за пачатковы перыяд ІІ Сусветнай вайны. Зінаіда Сцяпанаўна ў сваіх успамінах адзначае асаблівасці біяграфіі свайго бацькі за перыяд 1942–1944 гг. у агульнагістарычным кантэксце, які дамінуе ў наратыве, што сведчыць аб адсутнасці падрабязных звестак, звязаных з Сцяпанам Пятровічам, у параўнанні з перыядам 1939–1941 гг., дзе ўспаміны маці Зінаіды Сцяпанаўны, як сведкі падзей, з'яўляецца дамінуючымі і дазваляюць аднавіць тагачасную рэчаіснасць. Ва ўспамінах Зінаіды Сцяпанаўны пра далейшы лёс бацькі прысутнічаюць ўскосныя звесткі аб прыкладным маршруце арміі Андэрса з СССР на Бліжні Усход і ў Італію. Рэспандэнтам агучаны спіс артэфактаў, звязаных з перыядам службы ў Арміі Андэрса: ікона, якая з'яўляецца сямейнай рэліквіяй рэспандэнта; крыж, магчыма за бітву пры Монтэ-Касіна; медаль, не індэтныфікаваны.

Пасля бітвы пры Монтэ-Касіна, якая адбылася ў траўні 1944 г., Сцяпанам Пятровічам былі зроблены фатаздымкі, якія адносяцца да андэрсаўскага перыяду яго біяграфіі (фота 3, фота 4, фота 5).



**Фота 3. Палячонак С. П. у 1943–1945 /46 гг. (з сямейнага архіву Сіндрэвіч Зінаіды Сцяпанаўны)**



**Фота 4. Палячонак С. П. у перыяд 1945–1947 гг. (з сямейнага архіву Сіндрэвіч Зінаіды Сцяпанаўны)**



**Фота 5. Жаўнеры 2-а Польскага корпуса (з сямейнага архіву Сіндрэвіч Зінаіды Сцяпанаўны)**

Репозиторий ВГУ

На фота № 3 фон звяртае на сябе больш увагі, чым у двух папярэдніх. Відавочна, што фотакартка, зроблена на індывідуальны фотаапарат, можа быць аднесена да італьянскага перыяду біяграфіі Сцяпана Пятровіча, аб чым сведчыць архітэктура будынкаў, якія выступаюць фонам. Адсутнасць дадатковага рыштунка і знакаў адрознення дазваляе сцвярджаць, што фота было зроблена ў вольны час. Па выгляду дрэва на фоне можна зрабіць выснову аб прыкладным часе, калі было зроблена фота (лета). Сама форма відавочна летняя, маецца бярэт, што дадаткова сведчыць аб тым, што фота было зроблена летам, пасля 1943 г., калі 2-і Польскі корпус увайшоў у склад Узброеных Сіл Вялікабрытаніі. Дадатковым з'яўляецца алтарнае кальцо на левай руцэ, якое сведчыць пра сямейны стан асобы (сімвал вернасці шлюбу).

Фотакартка № 4, магчыма, магла быць зроблена ў студыі з мэтай выкарыстання яго ў дакументацыі, аб чым сведчыць факусіроўка аб'ектыва на асобе і адсутнасць дэталёвага фону ці элементаў дэкору, што, з аднаго боку, робіць яго падобным да фота № 1, але з другога, адрозневае накірунак позірку асобы (ніжэй аб'ектыву) і само мешчанне аб'ектыву (крыху вышэй асобы). Падобны ракурс адкрывае ня толькі твар асобы, але і вайсковыя знакі (якія адпавядаюць англійскім [3]) і ўзнагароды (на фота бачны ленты ўзнагарод). Форма відавочна англійская, не паходная, што сведчыць аб тылавой ці пазабаявой дыслакацыі фармавання вайсковага, у якім служыў Палячонак Сцяпан Пятровіч. Гэта гіпотэза падмацоўваецца фактам передыслакацыі Польскага корпуса у 1946–1947 гг. у Вялікабрытанію з Цэнтральнай Італіі, дзе корпус дыслакаваўся ў 1944–1945 гг.

Фатаграфія № 5 мае групавы характар, што стварае перашкоды ў індэнтыфікацыі Палячонка Сцяпана Пятровіча. Адсутнасць інфармацыі аб часе і месцы не дазваляе вызначыць перыяд, у які было зроблена фота (ваенны ці пасляваенны). Знешні выгляд жаўнераў дазваляе сцвярджаць, што фота магчыма было зроблена ў перыяд, які адпавядае форме вайсковай на фота (восень, вясна). Архітэктура будынку відавочна еўрапейская, што вызначае частку света (Еўропа), у якой было зроблена фота і прыкладны час (1943 – 1947 гг.). Галоўнай фігурай на фота з'яўляецца капелан вайсковы, знешне падобны да капелана праваслаўнага, што кажа аб нацыянальным і рэлігійным складзе ўдзельнікаў фотаздымка. Магчыма, фота зроблена ў Вялікабрытаніі пасля перадыслакацыі арміі Андэрса з Італіі. Калектыўнае фота магло быць зроблена на памяць, што дазваляе ўдакладніць час стварэння фатаздымка (1947–1948 гг., час расфармавання корпуса).

Зінаіда Сцяпанаўна ва ўспамінах пра лёс бацькі асобна адзначае, што ў яго быў выбар: застацца ці вярнуцца на радзіму:

*"У 47-м... А яны, можна было аставацца на гэтым, там у арміі служыць, ці работаць. Яны, кстаці, палучалі жалаванне. У яго там нават былі акцыі. Яны куда-та эці дзеньгі ўкладавалі. Ёсць фатаграфіі, дзе ён у форме, армейскай, наверное гэта англійская была, а можа польскую такую рабілі. [прабел]. А тады сказалі, што можна спісацца. Ну як: напісаў ён пісьмо, гэта ж пісьмо, пакуль дашло, пакуль нашлі, дзед адпісаў пісьмо, пакуль гэта, тады папа стаў зваць маму, каб дзед атпусціў маму, туды к яму ехаць, таму што там папу сказалі, ня толькі папу, вы пападзіцё ў Сібір. У нас жа гэтыя лагеры былі і да вайны. Колькі там памерзлі і пагібла. [прабел]. І папа прыехаў у 47-м, можа не два гады прашло, гэта я ня помню. Ня тое што ня помню, не дапытывалася"* [2].

Зінаідай Сцяпанаўнай агучаны прыкладны год вяртання бацькі з Вялікабрытаніі (1947 г.). Увагу звяртае перапіска паміж ім і сям'ёй да вяртання, што сведчыць аб існаванні паштовай сувязі паміж Вялікабрытаніяй і СССР. Рэспандэнтам адзначаны факт набыцця акцый. Апошні факт патрабуе ўдакладнення, так як гэта інфармацыя мае спецыфічны характар і выклікае сумнеў у дакладнасці факта. Тым не менш, дадзены факт паўплываў на наступныя падзеі:

*"Прынялі яго, і добра. Яны хату строюць, папа з мамай, аднаго дзіцятка радзілі, памёр, тады, яны ўжо пастроілі хату, і зрабілі... кузніца у папы была і карова, і аставалася ў той хаце зрабіць толькі печку, была вясна-зіма. А ў 50-м мама радзіла двух дзяўчынак, і ўжо па годзіку дзевачка была, і тады прыехалі гэтыя кагэбісты, паначаваў у прэдседацеля калхоза, у Дубавых, а тады раніцай прыйшоў з пісталетам, а жонка таго прэдседацеля хацела прыйсці сказаць нам, у гэнага чалавека дзе начаваў, той чалавек сказаў: Ня смей. [прабел]. Да гэтага іх сабралі і сказалі, што ў каго ёсць акцыі, давайце ў Полацк етце, аддавайце і вам дзеньгі вернуць. Ну яны павазілі тыя акцыі. Ну і факцічэскі іх перапісалі. Вот і Андэралаў бацька гэдак сама быў. Ну а тады прыйшоў гэты з пісталетам сюды: Сабірайцеся. [прабел]. Пасадзілі іх і дзяцей у прыцэп трактара гусінечнага, кругом слякаць, сырасць і паязлі іх у Глыбокае. Пакуль усіх збіралі, гэтыя дзяўчаткі прастылі і дзяўчаткі памёрлі. [прабел]. Ну яе павялі і яна расказала як усё было. Прывялі таго глаўнага, відна яму дасталася. [прабел]. Ну і завязлі іх туды ў 51-м, у апрэлі месяцы, к лету прывязлі, памясцілі ў бараکі і ў лес, у тайгу. Лес загатаўліваць"* [2].

У сюжэце адлюстравана вяртанне Сцяпана Пятровіча Палячонка ў Дубавое ў другой палове 1940-х гг. Узгаданыя раней каштоўныя паперы, а дакладней іх абмен на рублі, меў наступствы: у выніку, падчас адной з хваль пасляваенных рэпрэсій (дакладней, у 1951 г., што адзначана Зінаідай



Репозиторий ВГУ

Сцяпанаўнай Сіндрэвіч), сям’я Палячонкаў (Сцяпан Пятровіч з жонкай і дзецьмі) былі высланы за Урал. Зінаідай Сцяпанаўнай узгаданы дрэнныя ўмовы падчас знаходжання ў Глыбокім, вынікам якога стала смерць дзяцей С. П. Палячонка. Цікавым з’яўляюцца ўспаміны рэспандэнта пра штодзённасць жыцця рэпэсіраванай сям’і ў Сібіры:

*“Мама с папай стаяць там такія ў чорным, два такія скучныя-скучныя, гэтыя неяк у белым. Сібіракі падумалі, што зэкаў прывязлі, [прабел], а тады после яны прынялі іх, [прабел], тады пазналі што папа каваль. [прабел]. І гэта счасце, што іх не сагналі у “летні лагер”, на Камчатку. [прабел]. Тады яны на кварціры былі, у жанчыны. Маму ўстроілі на пякарню, а пасля ў школу уборшчыцай, тады я радзілася, а калхозаў не было. Можна было сваё дзяржаць, ніхто не канфіскоўваў як там, і папа казаў, што давай астанімся. А мама сказала, што я не хачу каб маю дзяўчыну мышкара ела. [прабел]. Сталін памёр у 53-м. Спачатку было ўсё ціха: усе плакалі, а тады як быў с’езд, да мамы суседка прыбягае і кажа: Ай-яй-яй. Мой сарваў партрэт Сталіна і пачаў рваць. А камуніст кажыць быў такі ваабшчэ. А тады, аказваецца, што разаблачылі Сталіна. Тады сталі дамоў адпускаць. У 57-м гаду ім казалі, што хочыце едзце ў Польшчу, ці едзце дамоў”* [2].




**Фота 6. Палячонак С. П. з жонкай у 17.06.1951 г. (з сямейнага архіву Сіндрэвіч Зінаіды Сцяпанаўны)**

Рэспандэнтам адзначаны прыкметы знешняга выгляду асобаў на фота № 6: чорные, простае адзенне. Меркаванне аб стане маёмасным адзначана ў наратыве вышэй. Параўнальны аналіз фотаздымкаў 1 і 4 з фота № 6 дэманструе пагаршэнне знешняга выгляду ў выніку праблем з харчаваннем і ўвогуле асаблівасцямі жыццёвага перыяду 1950-х гадоў. Па сутнасці, фота № 6 з’яўляецца візуальным адлюстраваннем апошняга наратыву, што дазваляе выкарыстоўваць дадзены фотаздымак і аповед пра перыяд 1950-х гадоў не як асобныя дадатакі адзін да аднаго, а як суцэльную крыніцу, узбагачаючаю агульны масіў крыніц. Фота групавое. Сам факт фатаграфавання выклікае патрэбу ў паляпшенні знешняга выгляду, што бачна па адзенні іншых удзельнікаў фатасэсіі, што з’яўляецца тыповым для таго перыяду. У сувязі з абмежаваннем даследавання па часе (1939–1954 гг.), у артыкуле не разгледжана падрабязна вяртанне і рэабілітацыя рэпрэсаванай сям’і Палячонкаў на Радзіму. Абмежаванне 1954 годам звязана з мэтай падзелу перыяда біяграфіі Сцяпана Пятровіча Палячонка на перыяд службы ў Войску Польскім (у тым ліку і Польскім корпусе, які можна лічыць працягам папярэдняга перыяду – андэрсаўскі перыд), уплывам статуса жаўнера польскіх васковых злучэнняў на наступны лёс і сібірскім перыядам. Храналагічныя межы даследавання (1939–1954 гг.) абумоўлены наяўнасцю фотаматэрыялаў, а таксама кардынальнымі зменамі ў эканамічным становішчы сям'і Палячонкаў з 1954 г., а менавіта паляпшэннем жыллевых умоў, інтэргаваннем у мясцовае асяроддзе.. Фактычна, пасля 1954 года пачынаецца новы перыяд у біяграфіі ня толькі Сцяпана Пятровіча, але і ўсёй сям’і Палячонкаў. Вывучэнне побыту пасля адзначанага года, а таксама пасля вяртання з Сібіры, можа выступаць тэмай для асобнага даследавання.

Такім чынам, на падставе прадстаўленага матэрыялу, неабходна вызначыць наступнае:

Магчымыя скажэнні, якія з’яўляюцца дапушчальнымі пры ўліку суб’ектыўнага характару наратыву, як крыніцы гістарычнай, маюць патрэбу ва ўдасканаленні сюжэта ці яго асобных фрагментаў. Карысным з’яўляецца практыка спалучэння асобных сюжэтаў з адным фотаздымкам, які, як правіла, дае візуальнае ўяўленне аб асобным сюжэце ці маюць сувязь з ім праз наяўнасць дэталей,

Репозиторий ВГУ

звязаных з сюжэтам. Пры адсутнасці каардынат ці звестак аб часе, фотакартка дазваляе вызначыць прыкладны час ці месца пры ўліку кантэкста даследчыкам, што выклікае патрэбу ў звяртанні да іншых гістарычных крыніц. Асобныя элементы наратыву ці фота могуць з'яўляцца крыніцамі, пры іх наяўнасці ці магчымасці зафіксаваць у палявых умовах, для працягу даследавання ў адпаведнай тэме. Звычайна, калі фотакартка належыць рэспандэнту, апошні звяртаецца да павярхоўнага аналізу фота пры аповедзе, што можа абясцэніць карысць фотаматэрыялу. Інфармацыя, якую нясе фотаздымак можа стаць асобным сюжэтам, ці важнай складовай часткай пэўнай тэмай. Падобная практыка выкарыстання звязкі фотаматэрыял-наратыў з'яўляецца карыснай падчас біяграфічных даследаванняў ці вывучэння гісторыі паўсядзённасці.


1. Даваеная польская тапаграфічная карта цэнтральнай Беларусі [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://www.etomesto.ru/map-belarus_zapad/. – Дата доступу: 01.03.2021.
2. Запісана ў 2020 г. Згірскім Ю. І. ад Сіндрэвіч Зінаіды Сцяпанаўны 1954 г. н., у в. Янкі, Докшыцкага р-н, Віцебскай вобласці.
3. Нереализованные возможности военного союза (армия В. Андерса на территории СССР в 1941–1942 гг.) [Электроны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://militera.lib. ru/docs/da/terra_poland/01.html. – Дата доступу: 19.03.2021.


**Руссу О. Д.**

## ТВОРЧЕСТВО КАК ОДИН ИЗ ИСТОЧНИКОВ ИСТОРИИ БЫТА ВОЕННОПЛЕННЫХ ПОСЛЕ ОКОНЧАНИЯ СТАЛИНГРАДСКОЙ БИТВЫ

Изучение истории не представляется возможным без тщательного анализа многообразных исторических источников, отличающихся друг от друга содержанием, формой, способом подачи информации и пр. Условно исторические источники можно поделить на два вида: так называемые официальные источники и источники личного происхождения. Данная статья посвящена анализу источников истории быта военнопленных после окончания Сталинградской битвы.

К официальным источникам истории военного плена Второй мировой войны в СССР можно отнести официальные документы международного характера, например, Женевскую конвенцию «Об обращении с военнопленными» 1929 года. Кроме того, к этой группе источников относятся нормативно-правовые акты высших органов государственной власти (например, распоряжения Государственного комитета обороны, протоколы заседаний Политбюро ЦК ВКП (б) по вопросам обращения с военнопленными). Последние определяли основные вопросы содержания и использования труда военнопленных. Отдельную группу источников составляют документы (распоряжения, директивы, приказы) по линии органов НКВД-МВД СССР, которые непосредственно осуществляли работу с военнопленными и интернированными. «Наиболее ценными для исследователя с точки зрения информативности являются итоговые обзоры и доклады о деятельности УПВИ-ГУПВИ» [2, с. 115]. По мнению Кузьминых А. Л. именно в отчетной документации «обобщен обширный фактический и статистический материал, определены этапы в развитии Управления в целом и его отдельных структурных подразделений» [2, с. 116].

Особый интерес представляют документы региональных органов управления военного плена и интернированных, включающих в себя отчетную и справочную информацию по различным вопросам – размещения, учета, быта, питания, а также лечения военнопленных. Отдельную группу составляют отчетные документы лагерей, госпиталей, отражающие деятельность последних за те или иные периоды их существования. В частности, занимаясь исследованием социальных аспектов содержания военнопленных в Сталинграде, мы обращались к целому ряду распорядительных, нормативных документов законодательных и исполнительных органов власти, НКВД-МВД СССР, охватывающих все стороны жизни военнопленных. Проанализировали отчетно-информационные материалы о деятельности Главного управления по делам военнопленных и интернированных (УПВИ-ГУПВИ НКВД-МВД СССР), а также о деятельности региональных структур ГУПВИ НКВД-МВД СССР. Указанные источники включают в себя обзоры, справки, докладные записки, касающиеся истории лагерей, характеризующие работу, проделанную региональными структурами по содержанию, санитарному обеспечению, трудовому использованию военнопленных, а также трудности, с которыми столкнулось руководство лагерей для военнопленных на территории Сталинграда и области. Анализ документов показал, что в период с 1942 по 1943 гг. наблюдались трудности с размещением военнопленных (в разрушенном городе практически отсутствовали помещения, пригодные для жилья), только к 1946 году удалось решить вопрос с размещением [3, с. 198]. Аналогичная ситуация наблюдается в сфере обеспечения продовольствием, медикаментами, средствами личной гигиены. Кроме того, из докладных записок видно, что в лагерях наблюдалась острая нехватка медицинского персонала, и поэтому часто приходилось прибегать к услугам врачей из числа военнопленных.

Репозиторий ВГУ